**Узорны ансамбль танца «Мілавіца»**
**ДУА «Уваравіцкі цэнтр дзіцячай творчасці**
**Буда-Кашалёўскага раёна»**

Ансамбль танца «Мілавіца» ажыццяўляе стабільную культурную дзейнасць з 15 жніўня 2005 года на базе дзяржаўнай установы адукацыі «Уваравіцкі цэнтр дзіцячай творчасці Буда-Кашалёўскага раёна». 12 жніўня 2015 года, на падставе рашэння калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь № 39, за дасягнутыя поспехі ў развіцці аматарскай мастацкай творчасці, папулярызацыю нацыянальных культурных традыцый, мастацкі ўзровень і актыўную канцэртную дзейнасць яму прысвоена найменне «ўзорны аматарскі калектыў», якое было пацверджана 7 ліпеня 2018 года і 17 студзеня 2020 года.

На дадзены момант у ансамблі займаецца 78 навучэнцаў ад 4 да 20 год. З 2005 года кіраўніком калектыву з'яўляецца Кабаева Людміла Аляксандраўна.

Кожны месяц праводзяцца культурныя мерапрыемствы, канцэрты, творчыя сустрэчы, майстар-класы, сустрэчы з носьбітамі рэгіянальных харэаграфічных традыцый. Штогадова праводзяцца справаздачныя культурныя мерапрыемствы з абноўленым рэпертуарам. Ансамбль танца – актыўны ўдзельнік раённых, абласных, рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў і фестываляў, сацыяльна-значных акцый і праектаў. Выхаванцы калектыву маюць высокі ўзровень выканальніцкага майстэрства, сцэнічнай культуры.

Аснову рэпертуару складаюць народна-сцэнічныя танцы, сцэнічныя апрацоўкі фальклорных танцаў. Таксама вывучаюцца і выконваюцца побытавыя танцы («Лявоніха», «Какетка», «Заёнец», «Ойра», «Падэспань», «Кракавяк», «Матлёт» і гэтак далей). Побытавы танец дазваляе пазнаёміцца з багаццем танцавальнай творчасці Беларусі, якое служыць дзейсным сродкам грамадзянска-патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення, фармавання нацыянальнай самасвядомасці.

Удзельнікі ўзорнага ансамбля танца «Мілавіца» праводзяць мэтанакіраваную пошукава-збіральніцкую работу па вывучэнню рэгіянальных асаблівацей выканання танцаў, выгляду традыцыйнага беларускага адзення. Вынікам такой работы стала стварэнне «Вянка побытавых танцаў», рэканструкцыя традыцыйнага беларускага народнага касцюма.

Узорны ансамбль танца «Мілавіца» – актыўны ўдзельнік абласных, рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў.



